Беларуская работніца і сялянка.
1929.
№ 1-12

3ок-1
1844

6 05

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

Старшыня савету робіць справаздачу.

№ 1
СТУДЗЕНЬ
1929 г.

Инв. 1953 г. БА 828.

РАБОТНИЦЫ, КРЕСТЬЯНКИ
и все трудящиеся женщины

РЕДАКЦИЯ ЖУРНАЛА „Беларуская Работніца і Сялянка“

извещает своих читателей, что наш журнал, выходивший до сего времени 1 раз в месяц

с 1-го января будет выходить 2 раза в месяц

Стоимость журнала при этом не повышается, а остается как и раньше

15 копеек в месяц

Чем об'ясняется переход нашего журнала на 2-х недельное издание?

В основном тем, что обслуживание широких масс читателей нашего журнала при двухнедельнике значительно улучшится. Выходя только раз в месяц, журнал не мог в достаточной мере, полно обслужить запросы работниц, крестьянок и других слоев трудящихся женщин. Журнал **„Беларуская Работніца і Сялянка“**, как и вся наша печать является одним из могучих орудий Коммунистической партии для вовлечения широких масс трудящихся к разрешению всех сложных задач по строительству социализма; широкому развертыванию самокритики, за улучшение работы всего нашего аппарата, в борьбу за социалистическое переустройство народного хозяйства страны.

Двухнедельник гораздо лучше сможет справиться с этими задачами, чем месячник.

Но для того, чтобы действительно справиться с этими огромными задачами, которые стоят перед нашим журналом, мы должны получить помощь самих работниц и крестьянок. Сама работница и крестьянка должна писать в наш журнал, освещать в нем все вопросы борьбы и строительства на фабрике, заводе, в мастерской, колхозе, совхозе и на селе.

Больше пишите в свой журнал, читайте свой журнал и двигайте его в широкие массы трудящихся женщин

Распространяйте свой журнал

Редакция

Паштовая скрынка.

Вярбоўшчыцы: Аб падцісцы на „Белрабсялянку“ друкаваць ня будзем. Пішыце факты, колькі жанчын падпісаліся на часопісь і на які тэрмін.

Аўтару вёршаў „Маўчаць ня будзем“. Прышліце ваш дакладны адрас.

Бабікаву і Пацярэнка: *Вершы: „Агата-дэлегатка“. Пераможаныя камсамолкі*, друкаваць гэтыя вершы ня будзем. Распрацованы слаба.

Крумік: Вы таварыш напішыце нам факты, якія-б сьведчылі аб удзеле жанчын у працы РСІ.

Журавлёвай. Аб гуртках „Прыхільнік часопісі“ матар'ялы былі перасланы праз жанаддзелы. У гэтым нумары мы друкуем аб працы ўпаўнаважаных.

Леанковіч Надзе, Зарецкай Цыле і іншым, хто пісаў аб дзесяцігодзьдзі жанаддзелаў: Вашы допісы спазьніліся. Друкаваць ня будзем. Пішыце нам аб тым, як працуюць і жывуць сялянкі, калгасьніцы, камунаркі. Кожная думка ў допісу павінна падкрэсьлівацца фактамі. Пішыце аб уддзеле жанчын у перавыбарах Саветаў.

Уфлянд: Калі пісаць у допісу „Прымаюць актыўны ўдзел“, то гэта зразумела толькі для вас на месцы. А для чытачак усей Беларусі трэба даваць факты, у чым выявіўся гэты актыўны ўдзел жанчын у працы: у сходах беднаты, працы Савету, каапэрацыі. Ваш допіс аб самаабкладаньні мы пераслалі ў „Беларускую Вёску“.

Зак-1
1844

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

Адрас рэдакцыі:
Менск, Савецкая вул., № 45
Тэлефон № 419

ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК
ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ
КОМУНІСТ. ПАРТЫІ (бальш.) БЕЛАРУСІ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На 1 месяц	.	.	.	15	кап.
„ 3 „	.	.	.	45	„
„ 6 „	.	.	.	90	„
На год	.	.	.	1 р.	80 „

№ 1 (51) || Студзень (январь) 1929 г. || № 1 (51)

10-годзьдзе першага зьезду КП(б)Б.

На гісторыі нашай слаўнай Камуністычнай партыі (бальшавікоў) мы вучымся мастацтву вялікай барацьбы за канчатковае вызваленьне ўсіх працоўных—за камунізм.

Зараз мы адзначаем дзесяцігодзьдзе з часу першага зьезду КП(б)Б. Гэта, бязумоўна, ня значыць, што дагэтуль ня было бальшавіцкіх арганізацый на Беларусі.

Яшчэ ў 1903 годзе існавалі на Беларусі бальшавіцкяі групы: Менская, Бабруйская, Палеская. Ім ужо і тады прыходзілася весьці барацьбу з рознымі дробна-буржуазнымі нацыяналістычнымі арганізацыямі, у асаблівасьці з БУНД'ам, а пазьней з Беларускай Сац. Грамадой, Поалей-Цыаністымі і г. д.

У часы імпэрыялістычнай вайны фронт праходзіў па самаму сэрцу нашай краіны. Дзякуючы гэтаму ўмовы жыцьця працоўных былі вельмі цяжкімі.

— Працоўныя масы Беларусі,—піша т. Кнорын,—вайною былі шчыльна падведзены да сацыялістычнай рэвалюцыі.

Нацыяналістычнае партыі, як Бел. Сац. Грамада, БУНД, меншавікі і іншыя, не маглі вырашаць пытаньні ў інтарэсах працоўных. Сваёй палітыкай яны вялі да далейшага занявольваньня працоўных мас. „Масы, у аснове вырашэньня ўсіх пытаньняў, ставілі пытаньне аб захопе ўлады, аб зямле", а яны, меншавікі розных колаў, далі загад чакаць устаноўчага сойму, у якім па іх праграме павінны былі ўдзельнічаць абшарнікі і капіталісты і там з імі **ўмаўляцца**. Гэтым меншавіцка-нацыяналістычныя партыі яскрава паказалі працоўным масам сваю контррэвалюцыйную сутнасьць.

І—„адзінай партыяй рабочых і сялянскіх мас магла быць і была партыя бальшавікоў, якая з сваёй бальшавіцкай пасьлядоўнасьцю разгортвала ў масах грунтоўныя, рашучыя, пільна патрэбныя лёзунгі—безадкладнае сканчэньне вайны, безадкладнае выгнаньне абшарнікаў і перадача іх зямель сялянству, устанаўленьне дыктатуры пралетарыяту, самавызначэньне народаў — сацыялізм". (Кнорын).

У асяродку т. Мясьнікоў, у групе—Чарвякоў, Жылуновіч, Рэйнгольд, Іваноў.

Шэраг відных бальшавікоў, знаходзячыхся на заходнім фронце (т. т. Кнорын, Мясьнікоў, Фрунзэ і інш.), аб'яднаюць асобныя бальшавіцкія групы і арганізацыі Беларусі і ўтвараюць асяродак партыі—Абласны Камітэт.

У лютым 1918 г. Беларусь была занята немцамі. Бальшавіцкая партыя пашла ў падпольле. Абласны Камітэт партыі пераехаў у Смаленск. Партыя бальшавікоў вядзе вялізарную працу ў нелегальных умовах. У Менску мелася захованая друкарня. Выдаюцца дзьве газэты: „Красный солдат"—на

Дзяржаўная бібліятэка імя ЛЕНІНА

нямецкай і „Подпольная Правда“ — на расійскай мове.

У студзені 1918 г. нямецкае войска пакідае Беларусь. Падае трон нямецкага імпэратара—Вільгельма. Узьнімаецца рэвалюцыйны рух і ў іншых краінах Заходняй Эўропы. На Беларусі ўтвараецца Ўлада Саветаў. З другога боку ідзе шпаркая падрыхтоўка капіталістаў да акружэньня Рэспублікі Саветаў.



т. Кнорын.

Для вырашэньня ўсіх важнейшых пытаньняў 27 сьнежня 1918 г. ў Смаленску склікаецца 6-я абласная канфэрэнцыя камуністаў. На гэтай канфэрэнцыі адзначаецца вялікі рост партыі—ад 5-ці тысяч к 5-й да 18 тысяч к 6-й канфэрэнцыі. Канфэрэнцыя разгледзела шэраг важнейшых пытаньняў, у тым ліку даклады т. Мясьнікова і Кнорына.

Асяродкам дакладу т. Мясьнікова было пытаньне абвяшчэньня Заходняй Камуны—самастойнай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай „Гэты захад прымаўся для таго, каб лепш праціставіць націску імпэрыялістаў, яшчэ больш узмацніць заваёвы Кастрычніка, каб адбіць напор ворага“ (з рэзалюцыі зьезду).

6-я канфэрэнцыя была абвешчана першым зьездам КП(б)Б. Т. Мясьнікоў, выступаўшы з гэтай прапановай, адзначыў, што тут дастаткова шырока, як ніколі, прадстаўлены ўсе партыйныя арганізацыі, знаходзячыяся на тэрыторыі Беларусі.

На першым зьезьдзе было абрана ЦБ КП(б)Б, у склад якога ўвайшлі т. Мясьнікоў, Кнорын і інш. Т. Мясьнікоў быў абран сакратаром.

Гэта было 10 год таму назад. Зараз мы знаходзімся напярэдадні 12-га зьезду КП(б)Б. Камуністычная партыя Беларусі, як і ўся ВКП(б) вядзе працоўныя масы да камунізму. Пройдзен вялікі і цяжкі шлях. Маецца многа дасягненьняў. Але яшчэ ня ўсё зроблена, яшчэ многа працы ўперадзе. У нас маецца яшчэ многа цяжкасьцяў. Прыходзіцца будаваць сацыялізм у краіне найбольш адсталай.

Мы ставім задачу **„дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны“.**

Лістападаўскі пленум ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б з усёй рашучасьцю паставіў гэту задачу. Нам трэба пераабсталяваць старыя прадпрыемствы, будаваць новыя і такія, якія выпрабляюць і машыны для самых прадпрыемств і сельска-гаспадарчыя машыны значна больш, як да гэтага часу.

Узмацніць каляктывізацыю сялянскіх гаспадарак (бедняцка-серадняцкіх), увесьці больш культурныя способы апрацоўкі зямлі як у каляктыўных, так і паасобных гаспадарках. Трэба павысіць ураджайнасьць сельскай гаспадаркі.

Выкананьне гэтых задач патрабуе ад усіх працоўных—рабочых, работніц, батракоў, батрачак, бядняцтва і серадняцтва—яшчэ большай пільнасьці і напружанасьці і працы ў барацьбе. Нам трэба павялічыць вытворчасьць працы, узмацніць працоўную дысцыпліну, аб'явіць барацьбу прагулам на прадпрыемствах, падняць вытворчасьць сельскай гаспадаркі.

Работніцы, батрачкі і сялянкі (бяднячкі і сераднячкі) супольна з усімі працоўнымі павінны яшчэ шчыльней згуртавацца вакол пастаноў партыі. Бо толькі пад кіраўніцтвам КП(б)Б мы пойдзем да нашай канчатковай мэты—да камунізму. **Лепшая, больш стойкая, вытрыманая частка работніц і батрачак,—у рады КП(б)Б, у рады партыі Леніна.** Удзесецярым нашы сілы для будаўніцтва сацыялізму.

На 1-е студзеня 1928 г. ў КПБ было жанчын усяго тры тысячы чатырыста сорак дзьве. З іх работніц—тысяча дзьвесьці восемдзесят сем, батрачак і сельска-гаспадарчых работніц—сорак тры, сялянак—дзьвесьці шэсьцьдзесят дзевяць.

У гэтым самым годзе на 1-е кастрычніка ў партыі павялічэньне жанчын на 405.

Работніц стала больш на 20, батрачак і сельска-гаспадарчых работніц—на 26, сялянак—на 83.

Гэты рост партыі недастатковы.

Узмацнім рады нашай партыі за лік лепшай часткі работніц, батрачак і бяднячак.

Мабілізуем свае сілы для перавыбараў.

Прашоўшая справаздачная кампанія Саветаў дае многа матар'ялаў як аб станоўчых, так і адмоўных момантах ходу кампаніі. Улічыць гэтыя матар'ялы, змагчы зрабіць правільныя вынікі з тым, каб лепш мабілізаваць сілы працоўных для перавыбарнай кампаніі,—вось што патрэбна рабіць зараз.

Справаздачная кампанія Саветаў дае матар'ял, які гаворыць аб тым, што **„рашучага пералому"— як гаворыцца ў дырэктыве ЦК і ЦВК, у галіне большага прыцягненьня батрачак і сялянак у Саветы на мясцох яшчэ не адчуваецца.** Большасьць матар'ялаў з месц дае малюнак нездавальняючай увагі пытаньню прыцягненьня сялянак на справаздачныя сходы.

У матар'ялах з Бабруйску мы чытаем: „З прысланых зьвестак па 5 раёнам бачна, што лік усіх удзельнікаў на справаздачных сходах складае 32,6 проц., а лік зьявіўшыхся жанчын складае 11,7 проц. агульнага ліку жанчын, якія павінны былі ўдзельнічаць у справаздачных сходах". Такія зьвесткі маюцца і па шэрагу іншых акруг і раёнаў.

Чым гэта тлумачыцца.

Галоўным чынам тым, што ня было зьвернута дастатковай увагі на падрыхтоўку жанчын да большага ўдзелу на справаздачных сходах. Па цэламу шэрагу раёнаў ёсьць веды аб тым, што батрачкі і сялянкі амаль што не запрашаюцца на справаздачныя сходы.

Па матар'ялах мы ўсё-ж бачым, што зацікаўленасьць сялянак работай Саветаў ёсьць. І пагэтаму зараз трэба больш падрыхтаваць працоўных жанчын да актыўнага ўдзелу ў выбарах новых органаў улады на мясцох, якія былі-б сапраўды выразьнікамі інтарэсаў беднаты, батрацтва і асноўнай масы сераднякоў на вёсцы.

Неабходна зараз-жа падцягнуцца, мабілізаваць усе сілы, каб у перавыбарчую кампанію падняць актыўнасьць жанчын-батрачак, калгасьніц, бяднячак і сераднячак.

Прыкладам у галіне актыўнасьці павінен зьявіцца жаночы актыў: сябры Саветаў, каапэрацыі, КСУ і г. д. Дэлегацкі сход павінен таксама больш прыняць удзелу ў гэтай працы. Мы ведаем, што ў мінулых перавыбарах, там, дзе дэлегаткі былі ўцягнуты ў актыўную работу па перавыбарах, мы мелі значна большую яўку жанчын на выбары. У Мазыры, дзе дэлегаткі былі лепш скарыстаны, як і ўвесь жаночы актыў на вёсцы, мы мелі 36 проц. зьявіўшыхся сялянак, у той час, як у Магілеве і Воршы мы маем 19 проц. яўкі. Неабходна ў пэрыяд перавыбараў зрабіць так, каб дэлегацкія сходы працавалі актыўна, каб дэлегацкія сходы абмеркавалі ўсё пытаньні, зьвязаныя з перавыбарамі, абмеркавалі наказ, удзельнічалі цалком у сходах беднаты, запрашаліся цалком на сходы бядняцка-серадняцкага актыву.

На дэлегацкім сходзе трэба абмеркаваць пытаньне аб тым, як трэба арганізаваць перавыбары, каб сялянкі маглі ў большай колькасьці прысьці на перавыбары. Абмеркаваць час, калі лепш вызначыць сход, дзе пакінуць на гэты час малых дзяцей, прыцягнуць да абслугоўваньня малых дзяцей—школьнікаў, піянэраў, арганізаваць для гэтай мэты дзіцячы пакой і г. д. Дэлегаткі павінны абмеркаваць кандыдатуры сябраў Савету, намечаныя ячэйкай, з тым, каб актыўным падтрыманьнем дапамагчы выбару іх.

Дэлегаткі павінны асабліва ўсебакова абмеркаваць жаночыя кандыдатуры ў Савет з тым, каб

Забалоцкія дэлегаткі на нарадзе ў с.-с.

дапамагчы ячэйцы адабраць самых лепшых, актыўных і аўтарытэтных батрачак, бяднячак і сераднячак у Савет. Дэлегаткі павінны дапамагчы партыі абраць у Савет ня менш 25 проц. сялянак. На гэтых сходах павінны ўдзельнічаць і старыя дэлегаткі, актывісткі, грамадчыцы.

Паміж дэлегаткамі новага і старога складу, паміж жаночага актыву трэба разьмеркаваць вучасткі, разьбіць хаты так, каб кожная дэлегатка, кожная актывістка адказвала за яўку на выбары вызначанага ліку сялянак, каб яна сачыла за тым, ці атрымалі гэтыя сялянкі абвесткі, і дамагалася таго, каб даручаныя яе ўвазе сялянкі абавязкова ўдзельнічалі на перавыбарах. Дэлегацкі сход павінен у пэрыяд перавыбараў зьбірацца часьцей з тым, каб сачыць увесь час за актыўнасьцю дэлегатак, дапамагчы ім у рабоце, падштурхваць, падцягваць тых, хто адстае.

Не павінна застацца ніводнай батрачкі, бяднячкі і сераднячкі, якая-б ня ўдзельнічала ў перавыбарах Саветаў.

Усе як адна на выбарчыя сходы!

С. Крэмер.

Антысэмітызму і хуліганству ня месца ў нашых радох.

Агонь па Чубараўшчыне.

На заводзе „Чырвоная Бярэзіна“, дзе працуюць сотні жанчын, дзе ёсьць ячэйка, жанарганізатар, фабком,—працавала маладая дзяўчына Поля Л. Цяжка склалася яе жыцьцё. Сіратою яна 6 гадоў пашла па чужым людзям. Служыла нянькай і прайшла добрую школу эксплёатацыі, зьдзекаў. Пасьля папала на завод. Здавалася, што для яе пачнецца новае жыцьцё—жыцьцё ў каляктыве, дзе яе ўцягнуць у культурную працу, асцярожна і чутка павядуць барацьбу з яе дрэннымі навыкамі, прыўчаць да кніжкі.

Але гэта толькі здавалася. Поля Л. спаткала на фабрыцы тыя-ж зьдзекі, насьмешкі. Работніцы патрабавалі пераводу яе ў другі цэх, не жадалі піць з ёй з аднэй шклянкі і г. д. Зьдзекі спаткала яна і ў фабкоме у культкамісіі ў жанарганізатара. Ніводнага ўказаньня ў судзе на тое, што Л. аддавалася за грошы, і адначасова ўпартая думка аб тым, што Л. прастытутка. Л. лепш усіх растлумачыла сваё павядзеньне. Ёй надакучыла яе адзіноцтва, і кожны раз, калі яна спадзявалася атрымаць апору, атрымаць мужа, таварыша,—яна верыла ўсім абяцаньням і аддавалася. Ёй часта абяцалі жаніцца, а яна па свайму разьвіцьцю—дзіцё, верыла ўсім. Яна нават верыла самому галоўнаму з гвалтаўнікоў, які, будучы ўжо затрыманы па справе, абяцаў ёй жаніцца, дапамагаючы такім чынам атрымаць прыхільнасьць суда. *Калі яго запыталі на судзе аб гэтай жаніцьбе і аб тым, ці зьяўляецца Л. яго нявестай—ён сьмяяўся. А Л. яму верыла і бегала па ўсім установам, каб яго памілавалі.*

Усе гэтыя абставіны зрабілі яшчэ больш страшным і яшчэ больш небясьпечным тое злачынства, якое зрабіла шайка хуліганаў у ноч з 3-га на 4 лістапада.

Зьнявага работніц, жанарганізатара, фабкома склалі ўпэўненасьць, што з Л. можна рабіць усё, што хочаш. Гэта думка аб'яднала групу хуліганаў, якія зараз на лаве падсудных—з сьведкамі злачынства.

Уначы з 3 на 4 лістапада група рабочых (цікава адзначыць—у большай частцы няпісьменных), адтрымаўшы напярэдадні кастрычнікавага сьвята грошы, выпілі. Пасьля гэтага яны спаткалі Л. на вуліцы, зацягнулі яе гвалтам у лес і тут, ня гледзячы на яе дзікія крыкі—„чуваць было на ўвесь горад“ (па выразу сьведкі),—білі Л., пагражалі: „заб'ю, зарэжу“, згвалтавалі яе па чарзе ў прысутнічаньні многіх любапытных, якія любаваліся гэтым злачынствам.

„Юзік, ратуй, братка“—крычала перапужаная Л., а Юзік з камсамольскім білетам у кішэні, спакойна адказаў ёй: „калі можаш, уцякай“.

Многа прышлося палажыць працы на тое, каб зразумелі сутнасьць злачынства ўдзельнікі працэса і сьведкі. Многія прызнаваліся, што яны ў першы раз задумаліся над тым, што мужчын блудных ёсьць многа, але-ж ніхто ня сьмее таптаць іх, як людзей, у гразь. *Што лёгкае павядзеньне—рэч дрэнная як з боку мужчыны, так і з боку жанчыны, але-ж не згвалтаваньнем магчыма лячыць гэтую хваробу і не „чубароўцы“ будуць яе лячыць.*

„Чубароўцы“ адтрымалі цяжкі урок. Ня варта зачыняць вочы на тыя вынікі, якія магчыма зрабіць пасьля гэтага працэсу. Нельга супакоіцца на гэтым прыгаворы. Толькі вялікая культурная праца, удумлівыя і чулыя адносіны з боку жан і культработнікаў дапамогуць дасягнуць канчатковай перамогі на фронце барацьбы з дзікасьцю, якую ўскрыў працэс.

М. Г.

Ад рэдакцыі:

Таварышы работніцы і сялянкі!

У нашым быту яшчэ маецца многа хваробных зьявішч. Гэта цяжкая спадчына, якая нам засталася ад мінулага прыгнечаньня. Мы павінны з гэтым змагацца.

Выкрывайце ўсе злачынствы. Прыгледзьцеся, ці няма такіх здарэньняў, як з Поляй Л., у вас на фабрыках, у цэху, майстэрні, у сельсавеце, вёсцы.

Пішэце аб гэтым у нашу часопісь.

Суд, разглядаўшы гэту справу, прыгаварыў: „Вяргуну і Мядведскаму па 10 год пазбаўленьня волі, Маслоўскаму (як недаросламу)—6 з паловай год, астатнім 4-м абвінавачаным па 4—5 год.

Справа аб старшыні культкамісіі, які прысутнічаў і не дапамог Полі Л., будзе разглядацца дадаткова ў крымінальным парадку.

Клясавы вораг ня сьпіць на заводзе „Камінтэрн“.

На заводзе „Камінтэрн“ 500 рабочых. Сярод іх—палова работніцы.

Сьпяшаюць на працу, клапацяцца аб вытворчай дысцыпліне, павышэньні якасьці прадукцыі. Кіпіць рабочае жыцьцё.

Але клясавы вораг, які на кожным кроку імкнецца перашкодзіць нашаму будаўніцтву,—і сюды пралез. Клясавы вораг спрабуе адурманіць адсталую частку рабочых, якія яшчэ добра ня ўцямілі інтарэсаў рабочае клясы, правільнай палітыкі камуністычнай партыі і Савецкай улады. Клясавы вораг бярэцца за старое царскае ўзбраеньке — імкнецца сеяць сярод рабочых нацыянальную розьнь. Спадцішка яны нагаварваюць адсталым рабочым, што ў нас улада „жыдоўская“, кіруюць усім жыды. Ёсьць яшчэ на заводзе такія, якія разьдзяляюць такую думку антысэмітаў.

Майстар шклазаводу „Камінтэрн“—Сьцяпанаў і яму падобныя маюць у сябе падсобнымі работніцамі яўрэек. Яны вельмі кепска адносяцца да гэтых работніц. Замест таго, каб дапамагчы, азнаёміць з працай тых работніц, якія спачатку з працай добра не азнаёміліся, майстры такія кажуць: „Табе тут ня месца. Жыдоўка павінна семячкамі гандляваць, а не каля варстату працаваць“. „Жыдоўкі ніколі не навучацца працаваць на вытворчасьці“. Такія словы чуюць ад гэтых майстроў работніцы-яўрэйкі. Справа гэта выкрылася ў час падзей на заводзе „Кастрычнік“.

Заўкомам і партячэйкай прыняты крокі, і зараз такіх зьявішч не назіраецца.

Сьцяпанаву і тым, хто за адно з ім, патрэбна ўявіць, што такімі адносінамі да работніц-яўрэек яны дапамагаюць нашаму клясаваму ворагу.

Рабкорка.

Бабруйскі р-н.

Домніна школа

Апавяданьне Галкі. Малюнкі Хмялеўскай.

Домна горача напаліла ў печы. Разоў тры яна закідала па абярэмку бярозавых дроў. Агнявыя языкі сквапна лізалі паленьні. Моршчылася, трашчэла бяроста і хутка срэбная скарынка яе рабілася чорнай, вуглістай. За тое цэгла ў пячным зеве з чорнай ператваралася ў чырвоную, пасьля стала белай, бы лахматай.

— Выграбі картоплю,—загадала яна большай дзяўчыне, якая пляла панчоху, пакалыхваючы нагою малога ў калысцы.

Марылька ціхенька адышла ад калыскі. Выграбла картоплю ў кашэлік, накрыла рушніком, заграбла жар і закутала комін. На гэтым у хаце скончылася штодзенная тупаніна.

— Мо' вячэраць будзем? — запытала Марылька.

— Не. Таты трэба пачакаць.

— Я і забыла, што сеньні тата павінен зьвярнуцца. Калі так, дык мы пасьпяшаліся. Вячэра прастыне,—сядаючы за другую кудзелю, неспакоілася Марылька.

У хаце было ціха. Толькі ўпярэмежку прашчалі Домніна і Марыльчына верацёны. Спакойна спала ў калысцы малое. Моўчкі, седзячы з нагамі на мурку, жалупаў зернята семак Юзік.

— Дзе ён запрапасьціўся? Няўжо хэўра выпіць зацягнула? Не, не павінна быць, каб Цімох запʻянстваваў. Не прапʻе грошы. Цалюткімі прынясе,—падумала Домна пра мужа.

— Мама-а-а, вяцэлаць хоцу-у,— капрысна заенчыў Юзік.

На цэлы тыдзень Цімох кідаў дамоўку. На заробкі ішоў. А таму з няпрывычкі чакаць прыходзілася нэрвова. Прыслухоўваліся да кожнага грукату з надворку. Усё здавалася, што бацька.

Неспадзявана ляснула клямка. Адскочылі хатнія дзьверы. У хату напорыста, адзін за другім, пакаціліся сівыя клубы марознага паветра. А за імі, з адным плячом нахіленым уніз, вайшоў Цімох. Вусы і барада зарасьлі марозам. Лапці рыпалі ад кожнага руху. Цімох моўчкі сеў на ўслоне. Нават сьвіткі і шапкі ня зьняў, не атрос.

Неспакойныя думкі мігнулі ў галаве Домны.

— Хворы ці пʻяны? — падумала яна. Кінула вачыма ў бок Цімоха, які сядзеў згорблены, выцягнуўшы ногі. Талы сьнег з вусоў і барады буйнымі кроплямі капаў на падлогу. Домна ня ведала, як абазвацца да мужа.

— Ну і мароз раптам стукнуў,— няўцерпела яна.

Цімох маўчаў.

— Тата плысоў. Есьці хоцу,— адазваўся зноў Юзік.

Цімох пасоваў лапцямі па падлозе, пасьля глуха прабурчаў:

— Ня чуеш, маці! Мусіць і ня брэшуць людзі, калі кажуць, што ў цябе ў галаве ня муж і ня дзеці, а толькі глупства рознае.

Домна зьдзіўлена пазірала на мужа. Новы задзірысты тон незразумелым быў для яе. Адкуль ўзялося гэта ў заўсёды рахманага, спакойнага Цімоха.

— Цябе-ж чакалі з вячэраю,— ціха адказала яна.

Устала. Падала вячэру на стол. Але ніхто да яе не хацеў першым дакрануцца.

Мусіць пара ад картоплі юхаю казытнула ў носе галоднага, стомленага Цімоха. Ён перш заёрзаў на месцы. Пасьля ўстаў, зьняў кажух, шапку, павесіў на крук, які быў каля невялічкага партрэту Леніна, прылепленага да сьцяны над іншымі малюнкамі, выразанымі з газэт. Моўкі сеў за стол. Чуваць было толькі смачнае сёрбаньне і хруст гуркоў на зубах, які быў спачатку вельмі заядлым, пасьля паступова марудней, а потым і зусім сьціх.

Пад'еўшы і адагрэўшыся, Цімох стаў лагаднейшым. Хоць тым самым суровым тонам, але пачаў гаворку.

— Я казаў табе, у чужое проса ня тыч носа. Казаў—ня лезь у абутак не па назе, бо вялікімі чабоцямі музалі нагоніш. Так і вышла памоему. Недзе дзецца ад сораму. Людзі праходу не даюць.

— Чаго, за вошта? — запытала Домна. Але сама крыху скеміла, аб чым гаворка.

— Завошта, пытаеш. А школа твая дзе? Навошта было зацяваць. Ні па цябе людзі ёсьць. Падумае, — сябра Савету. У людзей бабы, як бабы, а ў мяне замест бабы, сябра Савету. Сьмяхота. Пуды людзкія пазьбірала, вагнала ў зруб. Ледзь дах нацягнулі. І пад дахам згніе так, бо людзей больш не падвядзеш. Не паслухаюць твае гаворкі.

Домне крыўдна стала.

— Што цябе сеньні з школай падкусіла. Пачалі і кончым. Гаворка людзкая цябе не датычыцца. Мая віна, хай і лаюць мяне. А ты пры чым тут.

— Як пры чым? Можа-ж муж я табе, а ты мне жонка, ці не?

— Дык што з таго, што жонка. Хіба для таго, каб грызьці было каго, — упэўнена сказала Домна, кладучы спаць Юзіка, які задрамаў за сталом.

Калі дзеці паляглі спаць, Домна села каля мужа.

— Ты ня гневайся, ня злуйся. Ня слухай людзкой лаянкі. Лепш толкам раскажы, аб чым ішла гаворка.

Цімоху неяк сорамна зрабілася адразу кідаць насупленасьць. Але цёплая хата, вячэра і ласкавая жонка перамагла яго.

— Што казаць. Іду дамоў, а каля школы людзкі гурт. Мяне клічуць. Сьмешкі ўзьнялі. Трэба— кажуць — цябе з Домнай прывязаць да зруба, каб пільнавалі людзкія пуды. А тут, як на злосьць, Зьміцер Коршак праехаў. Спыніўся і ён. Зубы скаліць. Вы—кажа—чакайце Домнінай школы, а я сваіх дзяцей у Зарубанае вучыцца адвёз. Рагоча. Сказаў і паехаў.

— У Зарубанае, баіш?—з некім глыбокім сумам запытала Домна.

— Ато-ж куды. А людзі яшчэ больш злуюцца. Расьлі мы невучамі, і дзеці цёмнымі астануцца,— кажуць яны.—На бабу даверылі. Дзе вы бачылі толку. Што з таго, што яе ў Савет абралі. Усё роўна розум бабскі. Яна ляпнула, а мы паверылі.

Уступіўся Трахім Бэндзікаў.

— Што вам Домна родзіць школу ці што,—кажа ён, — хоць яна і сельсаветчыца. Твой тут пуд і Домнін таксама. Чаму-б на цябе не пагаркаць за тое, што зруб гніе, і дзеці па вуліцы каменьнямі ў сабак шыбаюць. Распачалі і да канца не давялі. Аднолькава сэрца баліць табе, мне, Домне і ўсім нам. Само ня робіцца. Мо'-б ты хацеў, каб за пуд жыта табе Домна на печы школу пабудавала.

Гаўрыла за гэтыя словы біцца кінуўся да Трахіма. Ледзь адбаранілі.

Домна ня чула апошніх слоў мужа. У галаву яе засела якаясь думка, баламуціла, не давала супакою.

— Ты кажаш—Коршак дзяцей у Зарубанае адвёз. Значыцца, туды ўжо настаўніка прыслалі?— запытала яна.

— А як думаеш. Вядома, што прыслалі. Нам ня прышлюць у пустку. Ні вокан, ні лавак, падлога ня скончана.

— А кепска, Цімоша. Кончыць не багацька засталося. Па глупству, па нядбайнасьці людзкой. Няўжо так і будзе. Абрыдла гэта. Людзі вучацца, а мы... Эх, гора чубатае. Марыльцы пятнацаць гадоў, а сьляпая, нявучоная. Толькі скура на пальцах пааблазіла ад кастры. Зноў і малыя растуць. А людзкія хіба лепш. А мы з табою. Сорам глянуць на бальку ў каморы—уся ў палках ды ў крыжыках вуглем намаляваных. Гэта мы з табою так падлічваем заробкі і выдаткі. Не, Цімоша. Хіц—выйграу, хіц—прайграў. Заўтра я ў раён махні-драла.

— Праз раку пераправы няма. Ды і што табе раён. Пальцамі вокны не заслоняць.

— Добра. Лягайма спаць. Ты заўтра дома?

— Дома.

Хуткa ў хаце ўсе паснулі.

* * *

Досьвета прачнулася Домна. Абмахала ногі суконкамі, абула лапці, нацягнула кажух. Выходзячы, пабудзіла Цімоха.

— Дасі сена карове. У печы выпаліць Марылька.

— А ты куды?

— У раён.

Домна вышла з хаты. Пашла хутка па дарозе, прасьцяком, да школы. Падышла. Наўкола раскіданыя бярвеньні. Стружкі чуць стырчаць з-пад сьнегу. Ступіўшы на калоду, пераскочыла праз парог. Аглядала гаспадарчым вокам. Успомнілася ад пачатку да канца ўся гісторыя пабудовы школы.

На сходзе ўхапіліся за думку пабудовы школы. Сорам перад суседзямі няпісьменнымі расьціць дзяцей. Сабралі пуды. Лес набылі. Дзяржава дапамагла. Дастукалася Домна. Прышлося вывезьці лес. Ані рады, хоць ты што-хоць рабі. Пасьля як-кольвек вывезьлі. Злажылі зруб. Грошай цю-цю, кот наплакаў, а засыпаць трэба, канчаць школу. Ці за ўсё-ж грошы плаціць. А тут лісьце жоўкне. Туманы папаўзьлі. Восень у вочы заглядае. Мінула летняя гарачка. Домна прапанавала: „Дайце талакой школу скончым". Мужчыны сьмешкі строяць. А дзед Яўген нават прыклад прывёў:

— Камунай, значыцца? А памятаеш, як Зьміцер Коршак, калі пачуў, што зямлю ад яго адбяруць, хацеў камуну на сваёй зямлі наладзіць. Я добра гэта памятаю. Пазваў ён Алеся, Піліпа, Гаўрыла ды Сідара Комсіна, давай—кажа—зробім камуну на маёй зямлі. Камуна—дык камуна. Хлапцы згадзіліся. Алесь кажа: „Я ў камуне буду пісарам". Піліп захацеў быць столярам. Сідар—краўцом. А бабы стаяць ды і кажуць: „А мы з вас, дурняў, сьмяяцца будзем. Бо хто-ж у вас на зямлі працаваць будзе. Так і раскідалася Зьмітрава камуна. Столькі-ж толку выйдзе і з твае талакі.

Домна ня кідала думкі. Мужчыны адмовіліся, яна да жанок:

— Чые дзеці невучамі растуць?—нашы. Каму школа патрэбна?—нам. Дык хадзем, сілы прыложым, рук не пашкадуем.

Сабрала жанок паўсотні з гакам. Вышлі, нацягалі зямлі пад падлогу. Мужчынам сорам стала. Запраглі коняй, падвозіць пачалі. Нацягалі і на столь зямлі. А зараз... Ці-ж можна кінуць? Не!



Моўчкі сеў на ўслоне...

Домна вышла з школы. Подбежкі да перавозьнікаў. Людзі паўставалі. З каміноў поўз празрысты, вялы дым. Слаўся па доле, рассыпаўся, мазаў дахі вясковых хат.

— Дым сьцелецца, значыцца будзе адлега. Гэта на руку,—гаварыла сама з сабою Домна.

Пастукала ў вакно хаты, што на беразе.

— Перавязі праз раку!

— Чаго табе прысьпічыла? Ці-ж ня бачыш, якая крыга сунецца! Небясьпечна ехаць. Мо' жыцьцё надакучыла?

— Не, браце. Ехаць сьпешна трэба.

— Што з табою зробіш. Тут якраз яшчэ людзі чакаюць, мусіць, як і ты, вар'яты.

Селі ў лодку. Некалькі вёсел захапілі пра запас. Завілялі між крыгамі. Рубаюць сякерамі лядовыя скібы, адпіхаюць вёсламі. А рэчка гоніць іх уперад і ўперад. Прэцца гурбіна, налязае адна на другую, лужацца срэбнай лускою. Трашчыць. Раз-по-разу грукаюць дробныя крыжыны ў рабро лодкі. Грымне—ускалатнецца лодка, аж загудзе. А вада сьцюдзёная, пякучая. Брызгамі, як голкамі калючымі, абдае. І вецер дражніць.

— Зьмерзьнеш, Домна!

— Хіба разам з табою,—адказала яна.—Я ў кажусе. Хоць кароценькі, але кажушна латка, як родная матка, а ў ваце добра толькі сядзець у хаце.

Пераехалі раку. Домна ў Райвыканком да старшыні.

— Што-ж мы цялят у каго пакралі ці што?—сур'ёзна запытала яна.

— Сядай да печы. Абагрэйся. Дужа дзікая ты з дарогі.

— А мне суседзі яшчэ больш жару паддаюць. Чаму настаўніка нам ня прыслалі. Школу нам грызьці ці што?

— Куды-ж вам настаўніка таго, калі школа не дабудована, т. сябра Савету,—адказаў старшыня.

Але Домна была падрыхтавана да такога адказу.

— Вы нам дайце настаўніка, толькі добрага свойскага хлапца, каб ён не баяўся рукі папаскудзіць. А за астатняе я сама адказваю перад Рыкам і перад людзьмі.

— Ты жонка спраўная. Дагэтуль табе верылі. Дык, кажаш, настаўніка, ды яшчэ і добрага хлапца. Добра. Добра. Пакліч там інспэктара нарасьветы!

— А як з школаю?—запытаўся той.

— Я адказваю за гэта. Вы нам толькі настаўніка дайце,—яшчэ раз заявіла Домна.

Хутка справу вырашылі. Прызначылі настаўнікам камсамольца.

* * *

— Ці многа вучняў будзе ў вас? Ці цёплая школа?—дапытваўся па дарозе настаўнік. Пытаў пра агарожу, студню, кватэру. Аб многім пытаў.

Домна на ўсё давала адзін адказ:

— Навошта нам зараз гаварыць аб гэтым. Прыедзеш, сам пабачыш.—А самую шкрабала маркотная думка: А што, калі гляне настаўнік, завернецца, скажа—бывай здароў. А можа і яшчэ горш. Аблае, чаго добрага, Домну за тое, што ў пустку прывяла яго. Што будзе, то будзе!

Прыехалі засьвятла. Адразу ў школу. Глянуў настаўнік—насупіўся.

— Што-ж рабіць будзем?—пытае.

— Школу канчаць,—адказвае Домна.

Хадзіў моўчкі, аглядаў.

— Няўжо вернецца,—думалася Домне.

Папрасіў есьці.

А, значыцца, не бяда! Накарміла. Маўчаў. Думаў.

— Давай вырашаць, таварыш сельсаветчыца.

— Усяго самі ня вырашым. Трэба людзей клікаць.

А ў самой сэрца ёк! А што, калі людзі адмовяцца дапамагчы? А я-ж на сябе адказнасьць узяла. Тады ў раён хоць вачэй не паказвай. Не, ня можа быць.

— Вось што, таварыш настаўнік: шкло ў нас назапашана і ўвесь іншы матар'ял. Ёсьць і людзі, якія ўмеюць у руках сякеру ды гэбля трымаць. Няма вось толькі каму кіраваць працай.

— З гэтым паладзім. Мой бацька калісь добрым майстрам быў, і я ад яго чаму-кольвек навучыўся. Абы матар'ял быў. Кліч людзей.

Мігам сход склікалі. Людзі гулі, ня ведалі ў чым справа. Домна далажыла:

— Ня кончылі школу, сорам нам. Прыслалі настаўніка. Падналяжам—будзем з школаю, не—бывай здароў настаўнік. Тады будзем самі сябе за пяткі кусаць. Дык як, дзядзькі.

— Чаго як?

Дапамог настаўнік.

— Усе зьбірайцеся, вызначце чаргу і за ладом за працу. Зараз-жа. Нанач. Майстровых адабраць трэба. Астатнія ў дапамогу. Так ці не.

Некаторыя забурчалі каля парогу.

Прагаласавалі. Згадзіліся.

Застукалі малаткі. Засьпявалі пілы. Цяглі матар'ялы. А пад

Застукалі малаткі. Засьпявалі пілы.

поўнач і песьню гучным рэхам аддавалі новыя сьцены. Знайшліся свае шкляры, сталяры і пячнікі. Хутка школа засьмяялася новымі бліскучымі рамамі. Скончылі з падлогай, абмазалі печ. Пагрэліся. Адна за другой выраставалі беленькія, гладка выструганыя парты.

Працавалі двое сутак, пазьменна, і без перапынку на ноч. Настаўнік прыехаў ня з пустымі рукамі. Прывёз партрэты Ільліча і іншых правадыроў. Дзеці абярэмкамі цягалі елкі, плялі вянкі, прыбіралі сваю новую школу. На чацьверты дзень вёска ўпяршыню за часы свайго існаваньня сьвяткавала адчыненьне школы. Людзей бітком набіта. А з сьцяны пазірае Ленін. Дзяцей ня пускалі.

— Пасьпееце яшчэ нацешыцца.

— Во, гэта так. Домна дык Домна. Я-ж вам казаў, што яна баба ня толькі над бабамі, але і над намі. Бачылі-б школу, каб не яна,—казаў Трахім у сваёй прамове.

— Ці я-ж адна. Усе мы працавалі. Для дзяцей нашых. Зараз па шапцы цемру. Ня то толькі малыя, а нават старыя вучыцца пойдзем. Праўда, настаўнік,—пытала Домна.

— Ах ты, сельсаветчыца мая родная,—падаўшы ўперад галаву, кажа сват Яўмен. Размахнуў шырока рукі і схапіў Домну ў абнімку.

А побач Цімох любуецца школай і жонкай.

— Зараз так,—прапанаваў Трахім,—заўтра дзеці ў школу, а мы тым часам на гарачую руку агарожай школу абвядзем.

Доўга гутарылі. Не хацелася выходзіць з новае школы.



Не отстаем.

Избрав работниц в Дубровенский Горсовет в 1927 г., мы не промахнулись. Большинство депутатов работает активно. Благодаря практической работе советов, у нас уже создался прочный советский актив. Выделяются из него работницы, которых можно даже сейчас поставить во главе крупных советских учреждений.

Сейчас наши рабочие уделяют серьезное внимание проверке работы депутатов: оправдали ли они доверие масс, или нет. Контроль у нас еще был слабый. Точного учета, кто как работает в секциях горсовета, нет. У нас отчитывались некоторые работницы из секций: коммунальной, кооперативной и здравоохранения.

Сялянка Кабяшова--старшыня сель.-сав.

Дапаможам партыі ў барацьбе з кулако. беднякоў і лепшых сераднякоў. Наш л

Я работаю в кооперативной секции по хлебопечению и общественному питанию. На заседаниях Президиума Районного Исполнительного Комитета мне часто приходится выслушивать заявления избирателей по поводу качества хлеба или плохого отношения со стороны приказчика. Мы все это учитываем и производим расследования. Расследованием в инвалидной, кустарно-сапожной и портняжной артелях мы обнаружили растрату. В инвалидной артели сняли заведующего и еще 5 человек. Растрата оказалась в сумме 9000 руб. Дело находится в прокуратуре, а все эти лица под следствием. Наши партийные и профессиональные организации слабо руководили повседневной работой депутатов. Советская работа все больше и больше заинтересовывает рабочие массы.

Лозунг—все рабочие и работницы на перевыборы советов—осуществят работницы и рабочие Дубровенской ф-ки.

Член Президиума
Горсовета Эйдлина.

І слухаць ня хочам кулацкія байкі.

У вёсцы Скуратах адбыўся агульны жаночы сход. На ім гаварылі аб тым, што неабходна ў Савет абіраць жанчын. Намецілі больш актыўных і сьвядомых жанчын, якія-б добра працавалі ў Савеце. Кулачкі пачалі падгаварваць бяднячак, каб яны на перавыбарах Савету галасавалі за заможных. „Бяднячка менш вучаная, яна ня здолее добра працаваць“—казалі яны. Але бядняцкі як пачулі, што гавораць кулачкі, дык і слухаць не пажадалі іх. Бяднячкі намецілі больш бедных сялянак і аднагалосна парашылі раіць іх у склад Савету на перавыбарах.

„Мы ўсе пойдзем на перавыбары Савету і будзем галасаваць за беднату і лепшых сераднякоў“--казалі сялянкі на гэтым сходзе.

Селькорка.

Якая праца, такая і справаздача.

Сорам было слухаць справаздачу старшыні Іканьскага Сельсавету. Толькі языком малоў, а толкам нават на ўсе пытаньні не адказаў.

Сялянка Абібак Г Пятроўскі

Калі задалі яму пытаньне: „Чаму жанчыны ня ўцягнуты ў працу Савету“, то ён пачаў віну на другіх складаць. „Няхай жанчыны аб гэтым клапацяцца, а Савету і іншага клопату хапае“,—адказаў ён. Але мы ведаем, што гэта ня так. Савет павінен быць заці-

Слабы ўдзел сялянак у рабоце саветаў тарм тву вёскі. Сялянка—на перавыбары савет

...равыбары саветаў



...Выберам у саветы рабочых, батракоў, ...унг—25 процантаў жанчын у саветах.

...каўлены ў тым, каб уцягнуць ...насельніцтва ў працу яго.

Пасьля гэтага старшыні Саве... у задалі пытаньне, якія правы абавязкі мае сельсавет. „Пра... пытай бюлецень",—пачулі мы ў ...дказ.

Калі старшыня Савету ня ве...дае сваіх абавязкаў, то вядома, ...к і працаваў такі Савет. А пра...цавалі яны так: блудзяць у сва...й канцэлярыі, капаюцца ў папе...рах. Прыдзеш па справе, пастаіш, дамоў без талковага адказу. Падасі яму заяву на стол, то пе...ракінуць на вакно ці на шафу больш яе ніхто ня знойдзе. Пра...ала заява бяз ніякіх вынікаў.

На справаздачным сходзе ся...яне зазначалі, што мышы па...сьцягалі ўсю канцэлярыю нашага Савету.

Маркава.

Бягомльскі р-н.

...іна—нарсудзьдя ў ...-не.

Можна павучыцца ад жанчын—сябраў Савету.

На агульным сходзе ў вёсцы Доўгая Дуброва разглядалі пытаньне аб 2-й пазыцы індустрыялізацыі. Цішко Лазар хоць і сябра Савету, але пачаў агітаваць супроць пазыкі. У гэтай самай вёсцы ёсьць жанчына—сябра Савету—т. Таруціч. Яна першая падпісалася на пазыку, а сьледам за ёю падпісаліся на пазыку іншыя беднякі і сераднякі гэтай вёскі.

У вёсцы Загарбашша нашага Савету ёсьць сельсаветчыца Таненя Мар'я. Яна спраўна выконвае ўсе ўскладзеныя на яе абавязкі. Акрамя таго, яна прыкладна вядзе сваю гаспадарку. Т. Таненя заўсёды раіцца з аграномам, як лепш, пакультурнаму весьці гаспадарку, і дзякуючы гэтаму ў гаспадарцы маюцца посьпехі. Іншыя сяляне бяруць прыклад ад гаспадаркі т. Танені.

Зараз, калі праходзілі справаздачы нашага Савету, па некаторых вёсках прысутнічала на сходзе больш сотні жанчын. Яны задавалі пытаньні і выказваліся па справаздачы.

Байкоўская М.

Людзяневіцкі с-с.

Перавыбары Саветаў.

Мы на сходзе парашылі,—
Вылучылі жанок пяць
Самых лепшых дэлегатак
У Савет прапанаваць.

Добра гаспадаркай правіць
Аўдоцюшка-ўдава.
Мы ў Савет яе паставім—
Ў яе вумна галава.

Шырэй дзьверы батраку,
Бедняку, серадняку.
А кулак ды п'яніца
Хай лепш і ня квапіцца.

Цэлу ноч з кумой ня спалі,
Ды куды там было спаць,
Увесь час мы меркавалі,
Каго лепш ў Савет абраць.

Пісьменнасьці навучылісь
Нашы дэлегаткі,
Калі абяруць ў Савет,
Навядуць парадкі.

Дзед мой хоча йсьці на сходку,
А я тож на сход пайду.
Занясу дзяцей суседцы,
Там іх цэлымі знайду.

Сялянка—Кузьмінская—сябра райземкамісіі.

Магу прасьці, ткаць палотны,
Магу сеяць і саджаць.
Калі абяруць, то буду
І ў Савеце працаваць.

Памятай кожна кабета,
Дзень вялікі йдзе для нас.
Перавыбары Саветаў
Надыходзяць вось якраз.

В. Жураўлёва.

...зіць працу па сацыялістычнаму будаўніц...а. Батрачка і бяднячка—будзь наперадзе.

Правяраем работу Саветаў.

Царкву—пад школу.

У час справаздачы Саветаў наш раён быў падзелен на дробныя вучасткі. Папярэдня па ўсіх вёсках на сходах жанчын растлумачылі неабходнасьць іх удзелу ў справаздачных сходах. Дзякуючы гэтаму ўдзел жанчын у справаздачнай кампаніі Саветаў значна павялічыўся. Напрыклад, у Паташанскім Савеце палова прысутнічаўшых на справаздачным сходзе складалі жанчыны. Яны актыўна выказваліся на сходах. Жанчыны-бяднячкі выступалі з добрымі прапановамі, заўважвалі недахопы ў працы Савету. У в. Аляксандрава жанчыны казалі: „Курсы ў нас былі сельска-гаспадарчыя. Многаму нас навучылі. Навучылі, як жывёлу га-

Піанэрка чытае дзецям цікавую кніжку, а маці пашла на перавыбары савету.

даваць. Кепска толькі, што макухі няма". Жанчыны выступалі супраць таго, што ў каапэрацыі продаюць гарэлку.

Гэту ўзьнятую актыўнасьць працоўных жанчын патрэбна замацаваць большым уцягненьнем іх у склад Саветаў. Трэба рашуча змагацца з настроем мужчын, якія кажуць: „Калі жонка пойдзе працаваць у Савет, то кепска будзе з мужам жыць". Гэтакі погляд пануе ў Капчанскім Савеце.

Мы ведаем, што жанчына можа многа карысьці прынесьці ў працы Савету. У Сялішчанскім Савеце закранулі на сходзе пытаньне аб неабходнасьці пабудовы сямёхгодкі. Ня было адпавядаючага памяшканьня. Жанчыны першыя ўнесьлі прапанову забраць пад школу царкву. Так і парашылі большасьцю сходу: „Царкву ўзяць пад школу".

В. Жураўлёва.

Гарадоцкі р-н, Віцебская акр.

На кіруючую працу.

Па Круглянскаму раёну ў 4-х калгасах і 5-ці вёсках праведзены сходы жанчын, на якіх абгаварвалася пытаньне ўдзелу жанчын у надыходзячых перавыбарах саветаў. Гэта-ж пытаньне абгаворана на нарадзе актывістак і раённай канфэрэнцыі грамадчыц.

Кандыдатуры жанчын-актывістак, якіх можна сьмела раіць у склад будучых саветаў, у нас маюцца. У сёлетнім годзе мы павінны больш вылучаць жанчын на кіруючую працу і ў склад Саветаў—гэта думка ўсіх праведзеных па раёну нарад.

Бяднячкі перамаглі.

У в. Лавутках Скуратаўскага с.-с. на жаночым сходзе завялі гутарку аб тым, каго ў новы склад Савету раіць. Жанчыны намецілі кандыдатуру бяднячкі і актыўна абгаварвалі яе. А заможніцы—супраць гэтай кандыдатуры. „Няпісьменная яна, ня справіцца з сельсавецкай працай"—казалі яны. Большасьцю сходу парашылі на выбарах раіць кандыдатуру гэтай бяднячкі.

Гэты-ж сход даў наказ, каб Савет больш увагі зварочваў на патрэбы сялянак, бо ранейшы склад Савету да гэтага не прыглядаўся. Жанчыны абяцалі, што на перавыбары Саветаў усе, як адна, зьявяцца і будуць сачыць за тым, каб абраць добры працаздольны склад Савету, які-б абараняў беднату.

Зорка.

Жанчыны рыхтуюцца да перавыбараў Саветаў.

Падрыхтоўка да перавыбараў Саветаў у нас пачалася яшчэ да сьвята Кастрычнікавай рэвалюцыі. Да справаздачы сельсавета было праведзена дэлегацкіх сходаў — 6, агульных жаночых сходаў у вёсках—2, сходаў жонак служачых—17. Кульдней, на якіх прысутнічала каля 140 дзяўчак—4. Усяго ахоплена жанчын каля 700 асоб. Каапэравана ў час сходаў 16 жанчын батрачак-бяднячак. Падпісалася на часопісь „Бел. Раб. і Сял."—20 асоб.

Трэба падкрэсьліць, што сходы жанчын прайшлі актыўна. К ліку абіральніц жанчын на сход зьявілася 65 проц. На справаздачных сходах было менш—каля 30 проц. Актыўнасьць разгортвалася вакол пытаньняў: здавальненьня хлебам беднаты, культурнага выхаваньня жанчын, грубых адносін сакратара с.-с. **Раманоўскага.** „Працаваць у с.-с. ня можна, калі мы няпісьменны, трэба зьвярнуць больш увагі на ліквідацыю няпісьменнасьці".

У пункце Стаклы бяднячкі далі належны адпор калакам, гаворачы: „Досыць нас эксплёатаваць, у Савет кулакоў не дапусьцім".

У вёсцы Н. Марозы жанчыны больш імкнуцца да касьцёлу. Вось дзе патрэбна ячэйцы КПБ распачаць працу.

Пятушкова.

Ст. Бігосава.

БОРЬБА ЗА МИР.

Мы—страна диктатуры пролетариата. Мы строим социализм. Мы против империалистических войн. Мы знаем итоги империалистической войны 1914—1918 г.

66 миллионов в рядах армии принимало участие в этой войне, 9 миллионов убитых, не менее 12 миллионов искалеченных, около 300 миллиардов рублей человеческого труда потрачено на войну. В добавление к этому огромное разрушение городов и сел, выжженых войной.

А каковы ее результаты?

Еще большее закабаление трудящихся, еще большее обогащение кучки капиталистов империалистических государств.

Трудящиеся против империалистических войн, трудящиеся за мир. А вот капиталисты за войну. И они ее готовят. Готовят усиленно, беспрестанно и систематически. Скажут: „но ведь сейчас столько говорят о мире".—Да, говорят. Но еще в свое время один умный германский буржуазный политик, в минуту откровенности, сказал: „Никогда не врут так много, как перед войной, во время выборов и после охоты.

Нынешние разговоры буржуазии о мире только прикрывают усиленную подготовку к войне. Чем больше говорят они о мире, тем больше вооружаются. Вот факты: В 1913 г. в Северо-Американских Соединенных Штатах Великобритании, Франции, Италии и Японии численность армий доходила до 1 миллиона 753 тысячи чел. Сейчас 1 миллион 865 тысяч, т.-е. увеличалась на 112.000 человек; военные расходы этих государств составляли в 1913 г. 2.264.000 рублей в 1927—4.314.000 рублей, то-есть увеличение почти в 2 раза. Число боевых самолетов было в 1923 г. у этих держав (вместе с Германией) 2723, в 1927—4730 и т. д.

Коминтерн бьет тревогу, призывает к бдительности весь мировой пролетариат, всех трудящихся. Наша страна ведет активную политику мира. Всем известны наши предложения о полном или частичном разоружении. Наши предложения были отклонены. Буржуазия не хочет разоружения. Она хочет войны. И в первую очередь она готовит войну против нас—Республики трудящихся. Во главе этой подготовки стоит наиболее лютый враг—правительство Англии. В союзе с ней идет и правительство Франции. Они натравливают на нас окраинные государства и в первую очередь Польшу, Румынию. Недавно был разоблачен нашими газетами следующий план подготовки войны против нас:

1) Под руководством Французского генералитета устанавливается единообразное вооружение польской, румынской и французской армиями, 2) в Румынии, Юго-Славии создается несколько новых военно-промышленных заводов (в Польше за последние 5 лет построено 5 новых военно-промышленных заводов), 3) Салоникский порт использовывает для транспортирования военного снаряжения в Польшу и Румынию и, наконец, 4) французский флот непосредственно использовывается в Балтийском море против СССР.

Сейчас единственным способом противодействия влиянию коммунизма является совместное и нераздельное выступление Франции и Англии. Нам известны участившиеся поездки французского генерала Лерона в Румынию и вообще на восток и юго-восток Европы, очевидно с целью подготовить эти страны к войне с СССР. О нас распространяют разные небылицы. Те временные затруднения, которые мы сейчас переживаем, которые являются по существу затруднениями роста, изображаются, как начало краха советских денег; та волна самокритики, цель которой—усилить участие масс в социалистическом строительстве, использовывается капиталистами для того, чтобы нарисовать черную, безнадежную картину нашей жизни. Словом, хотят убедить рабочие массы всего мира, что у нас будто-бы ничего не выходит, что у нас не строится социализм, что рабочим и крестьянам становится все хуже и хуже и тому подобную чепуху.

Активная борьба мирового пролетариата в защиту нашей страны, разоблачение всех махинаций капиталистов авангардом рабочего класса—коммунистическими партиями и широкими массами трудящихся—это одно из препятствий к нападению капиталистических стран на СССР.

За оборону страны Советов.

(Из речи депутата французского парламента т. Кашэна).

Народы СССР и их руководители не перестают энергично заявлять о своей воле к миру. „Трудящиеся всего мира солидарны с российской революцией, с ее учреждениями, ее прогрессом, ее усилиями, ее страданиями. Они все сплотятся вокруг нее для защиты".

„Вам придется переступить через тела всего народа, чтобы попытаться задушить русскую революцию, и если вы даже все возметесь за это,—вы их не победите".

Во всех парламентах, где имеются коммунисты, с трибуны произносятся горячие речи в защиту нашей страны. На многих демонстрациях и митингах принимаются решительные протесты против враждебной политики буржуазии по отношению к СССР. Мировой пролетариат имел достаточно поводов убедиться, насколько искренни наши стремления к миру. Но покуда есть империалистические хищники, готовые наброситься на нас, мы, борясь за мир, восстанавливая мировой пролетариат против империалистических войн, указывая ему единственный путь уничтожения опасности войны—пролетарскую революцию,—мы должны одновременно укреплять нашу Красную Армию, усилить обороноспособность нашей страны. **Борьба за мир и укрепление Красной Армии—это две стороны одной и той-же задачи—борьба за социализм.** Укрепляя Красную Армию, мы даем возможность спокойно и уверенно строить социализм в нашей стране. А строя социализм в нашей стране, мы указываем мировому пролетариату путь уничтожения капитализма в их странах. Уничтожая капитализм, уничтожаешь и опасность и причины войны. Мы за мир, ибо мы за социализм. Капиталисты за войну, ибо они за капитализм.

Р. Кугель.

ЗА ЧЕРТОЙ СТРАНЫ СОВЕТОВ.

О жизни работниц в белой Эстонии.

В Ревеле на Балтийской бумаго-ткацкой фабрике работают 2800—3000 человек, из которых мужчин только 30 человек.

Система работы на фабрике большей частью сдельная, но цены на сделки настолько низки, что рабочие вынуждены работать сверхурочно, что, конечно не оплачивается.



Рабочы—амэрыканец Барр, з жонкай і дзіцём. т. Барр быў зволен з працы за ўдзел у забастоўцы.

Работницы работают вместе с сверхурочным временем 16 часов в сутки и за эти 16 часов получают 150—200 марок*), или 75 к.—1 р. в день.

Цены на продукты потребления средние: говядина—30 марок, баранина—36 м., телятина—32 м., свинина—55 м., масло—115—130 м., хлеб—8 м., сигный—18—24 м. за фунт, молоко—25 м. за литр, дрова—1800—2000 м. за сажень.

*) 1 марка-1/2 коп.

С ликвидацией закона квартирной платы, домовладельцы повысили цены на квартиры, например, за маленькую подвальную берут 300—500 марок в месяц, за комнаты верхних этажей совсем дорого.

По этим данным видно, почему рабочие должны работать 16 часов в сутки.

Когда рабочие требуют повышения заработной платы и уничтожения сверхурочных часов, их записывают в черный список и увольняют с работы.

Чтобы не было недостатка в квалифицированных работниках, правление завода ставит к каждому рабочему ученика, с оплатой 75 к. в день, которого через некоторое время обучения ставят на место уволенного рабочего.

В фабричных залах стоит половина машин, но все таки работают в две смены, в первой смене работает одна половина, а в другой смене—вторая половина машин.

На фабрике в каждом отделении смена кончается в разное время.

Такой метод введен для того, чтобы нарушить единство рабочих, чтобы они не могли организовываться и проводить общие собрания.

После 1 декабря 1924 года на Балтийской бумаго-ткацкой фабрике не было выборных рабочих (старост). Их пытались выбирать по фабричным отделениям, потому что общих собраний невозможно было собирать. Но когда невозможно проводить выборы по всем отделениям, тогда правление завода заявляет уже выборным старостам, что только тогда будет правление признавать рабочих старост, когда по всем отделениям они будут выбраны.

Такими приемами старается эстонская буржуазия сделать работниц неспособными к борьбе, но, несмотря на эти меры давления, эстонская работница вместе с рабочими уничтожит буржуазную палку и также, как работницы СССР, приступит к устройству новой жизни.

Работница.

ОКОЛО 4 МИЛЛИОНОВ БЕЗРАБОТНЫХ.

(Письмо Эстонскай работницы).

Дорогой товарищ.

По крайней мере, у вас есть одно утешение. Вам обеспечена еда и стена, ограждающая вас от непогоды. Между тем, я снова нахожусь без работы и ищу предпринимателя, который купил бы мой труд по угодной ему цене. Уже четыре раза в течение 7 месяцев я была выброшена на этот рынок рабов капитализма.

Я вижу, как они раз'езжают в своих дорогих автомобилях и преподносят своим бездельничающим женам драгоценности, шелка и пуделей за 2 тысячи долларов. А на ряду с этим я вижу, как зарплата понижается и предприниматели хвастаются „сокращением расходов".

Безработица обостряется с каждым днем. Считают, что в нашей стране насчитывается около 4 миллионов безработных. За последние несколько месяцев в нашем городе было несколько случаев самоубийств среди безработных.

Я надеюсь, что вы и другие товарищи не будете падать духом и, когда вы выйдете из тюрьмы, возьметесь за оружие и будете продолжать борьбу.

Передайте мои лучшие пожелания другим товарищам и не теряйте бодрости.

С товарищеским приветом.

Анна Кларк.

Мы вучымся. Будзем пісьменнымі.

Сялянкі, якія вучацца ў лікпунктах па Мазырскай акрузе выклікаюць усіх працоўных жанчын Беларусі расказаць на старонках „Белрабсялянкі“ аб сваіх посьпехах і перашкодах на вучобы.

Сто дванаццаць жанчын будуць пісьменнымі.

Па Людзяневіцкаму сельсавету сто дванаццаць жанчын ліквідуе сваю няпісьменнасьць. Нават радасна глядзець, калі заходзіш увечары ў школу і бачыш, што пажылыя сялянкі так старанна вучацца пісьменнасьці.

Мы заклікаем вучыцца ўсіх няпісьменных сялянак. Няхай яны пішуць у часопісь аб сваіх посьпехах.

Лагун М.

Сама прачытаю і грошы палічу.

З 1-га лістапада ў в. Ляскі адчынілі лікпункт. 25 жанчын стала наведваюць заняткі. „Трэба вучыцца. Калі я буду пісьменная, то ніхто мяне не падманіць. Сама прачытаю і грошы пералічу“—кажа Кароль Аўдоця. Наведваюць лікпункт усе падпішчыцы часопісі „Беларуская работніца і сялянка“. Яны кажуць, што ў вёсцы Ляскі хутка будзе многа больш падпішчыц, бо жанчыны стануць пісьменнымі.

Заняткі лікпункта праводзяцца 4 разы ў тыдзень, па вечарах. Пасьля заняткаў часьцяком праводзім гутаркі аб жаночых хваробах, а таксама чытаем часопісь „Беларуская работніца і сялянка“. „Хутка самі будзем пісаць у часопісь, але толькі ня ведаем з чаго пачаць“—казалі слухачкі.

Гарулева Ганна.

Ад рэдакцыі: *Мы раім вам у час каляктыўных чытак заняцца практычна пісаньнем допісаў. Гэта дасьць магчымасьць нашым чытачкам атрымаць першыя навыкі ў сялькораўскай працы.*

Будзем вучыцца.

Прымацавалі мы дэлегатак да лікпункту. Згадзіліся вучыцца нават жанчыны па 35—40 гадоў. Калі ў іх запыталіся: „Ці будзеце хадзіць у школу“, то яны нават пакрыўдзіліся за такое запытаньне. „Будзем абавязкова вучыцца“—казалі яны.

Сялькорка.

м. Чарэя.

Аб розным.

У каперацыі на ганку
Прадала яец пяток.
Набыла „Белрабсялянку“,
Пачытае мне сынок.

Бруду бойку абвясьцілі,
З хаты выграбем сьмяцьцё.
У чыталку зачасьцілі,
Ладзім новае жыцьцё.

Як ня квокча кулачок,
Хай хоць з шкуры лужацца.
Здам лепш ў касу пятачок,
З ёю лепш мне дружыцца.

Бюракрат, глядзі, каб была
Цеганіна зьведзена.
Калі скмецім непарадкі,
Напішам у газэціну.

Зроду бабкам і шаптухам
На грош не паверым мы.
Ні адна ад іх парадаў
Жанчына памерла.

Прося мела дзетак дзесяць.
Тры асталіся жывых,
Бо ня ўмела як дагледзець,
Гадаваць здаровых іх.

Мне часопісь расказала,
Як малых лепш гадаваць.
Я раней іх тузавала,
Зараз буду шкадаваць.

Я сваю дачку—Ганульку
Ад кудзелі адцягла.
У школу выпраўлю вучыцца,
Каб пісьменная была.

Больш ня прыдзецца сляпой быць
І расьпісвацца прасіць,
Бо ў лікпункце навучылась
Пісаць, чытаць і лічыць.

Ты ня плюй, Адарка, ў студню,
Бо прыдзецца ваду піць.
Сьмешкі строіш з нас ў лікпункце,
А пісаць прыдзеш прасіць.

Г—а.

Падрыхтоўка антырэлігійнага спэктаклю.

Яшчэ ня позна падпісацца на „Белрабсялянку“. Хутчэй сьпяшы. Будзеш удзельнічаць у розыгрышы. Упаўнаважаныя і падпішчыцы! Захоўвайце квіткі, па якім здаеце падпіску на „Белрабсялянку“.

Прачытай і другому перакажы!

Як павінен працаваць упаўнаважаны „Беларускай работніцы і сялянкі“.

У рэдакцыю паступаюць запытаньні ўпаўнаважаных аб тым, як яны павінны працаваць.

Кожная работніца і сялянка, якая цікавіцца нашай часопісьсю і хоча працаваць па распаўсюджваньні „Белрабсялянкі“, можа быць нашай упаўнаважанай.

На прадпрыемстве і пры дэлегацкім сходзе ўпаўнаважаныя абіраюцца. Перш як брацца за збор падпіскі на часопісь упаўнаважаны павінен сам добра азнаёміцца з часопісьсю, з яе зьместам. Пагэтаму ён павінен сам быць першым падпішчыкам на „Белрабсялянку“. Азнаёміўшыся добра з часопісьсю, упаўнаважаны зможа расказваць астатнім сялянкам, якія яшчэ ня ведаюць часопісі, аб чым гэта часопісь піша, якія яна дае парады. Упаўнаважаны павінен праводзіць гутаркі з сялянкамі аб карысьці часопісі. Гэта можна праводзіць на попрадках, вечарынках, у хаце-чытальні, на сходах, у гуртках. Трэба расказаць, як можна падпісацца на часопісь, колькі яна каштуе. Тутжа можна і вербаваць падпішчыкаў на часопісь.

Але, завербаваўшы падпішчыка, ні ў якім разе нельга на гэтым спыніцца. Трэба праверыць, ці сваячасова атрымліваюць падпішчыкі часопісь. Калі часопісь не атрымліваецца, упаўнаважаны робіць даведку там, дзе ён здаў падпіску, аб прычынах неатрыманьня. Калі гэта не дапамагае, трэба пісаць у рэдакцыю, дзе была здадзена падпіска, на якія месяцы, колькі паасобнікаў не атрымана. Трэба памятаць, што кепская дастаўка часопісі вельмі адбіваецца на падпісцы, і змагацца з гэтым.

Задача ўпаўнаважанага—нятолькі самому працаваць, але і ўцягнуць у працу па вярбоўцы падпішчыкаў астатніх працоўных жанчын. Для гэтага патрэбна арганізаваць „Гурткі прыхільнікаў часопісі“ ў кожнай хаце-чытальні, чырвоным кутку, у хаце грамадчыц, пры школах, лікпунктах.

Упаўнаважаныя павінны дапамагаць рэдакцыі, каб праз „Гурткі прыхільнікаў“ рэдакцыя магла ведаць думку чытачак аб часопісі. Што больш за ўсё цікавіць нашых чытачак, аб чым-бы яны хацелі даведацца з часопісі. Думкі чытачак аб гэтым патрэбна высьветліць галоўным чынам у час каляктыўных чытак часопісі і пісаць аб гэтым у рэдакцыю.

Часьцяком у часопісі друкуюцца апавяданьні, допісы і артыкулы, аб якіх рэдакцыя просіць чытачак выказаць сваю думку. У такіх выпадках упаўнаважаныя павінны першымі адгукнуцца прыслаць у рэдакцыю сваю думку, арганізаваць абмеркаваньне абгаварваемага матар‘ялу, прыцягнуць чытачак выказаць думку, напісаць аб гэтым у часопісь. Пры такой дапамозе ўпаўнаважаных рэдакцыя будзе мець цесную сувязь з чытачкамі часопісі.

Праца ўпаўнаважаных–гэта сур‘ёзная справа па ўнядрэньню жаночага камуністычнага друку ў гушчу работніц, сялянак і ўсіх працоўных жанчын, праца па падняцьцю культурнага ўзроўню працоўных жанчын гораду і вёскі.

Упаўнаважаныя павінны рабіць справаздачу аб сваёй працы на нарадах, дэлегацкіх і агульных сходах працоўных жанчын. Упаўнаважаныя павінны трымаць цесную сувязь з рэдакцыяй.

Упаўнаважаныя „Белрабсялянкі“ павінны быць у кожнай вёсцы. Дэлегацкія сходы, грамадчыцы і ўсе працоўныя жанчыны, распаўсюджвайце сваю часопісь „Беларускую работніцу і сялянку“.

Часопісь наша родная.

Мы выклікаем.

Раней у Любані было толькі 9 падпішчыкаў на часопісь „Беларуская работніца і сялянка“. Зараз з дэлегацкага сходу падпісаліся на „Белрабсялянку“ 55 жанчын. Большасьць з іх падпісаліся на 3 м-цы, але ёсьць і такія, якія выпісалі часопісь адразу на год.

Тых жанчын, якія падпісаліся толькі на 1 месяц, мы выклікаем працягнуць падпіску на нашу часопісь.

Мы выпісалі часопісь Талянскаму дэлегацкаму сходу на сьнежань месяц і выклікаем Тальскіх дэлегатак правесьці падпіску на „Белрабсялянку“ сярод працоўных жанчын вёскі Талі.

Бабруйская акр.

Дэлегатка—упаўнаважаная

Кацнельсон Ц.

Почему меня не позвали.

В деревне Рудне Карпиловского сельсовета есть 11 коллективных подписчиков на журнал „Белрабсялянка“. Все они малограмотные, а некоторые даже совсем не грамотные. Читают журнал коллективно, вслух. Собираются на читки не только подписчики, но и многие другие женщины. Если некоторых не позовут на читку, то потом за это обижаются. Одна женщина—Нарчук на читку не была приглашена. Потом она пришла с большой обидой „Надо другому поручить созыв читки, чтобы всех оповещали“—предлагала она.

Раньше девчата нашей деревни в церковь ходили, пели там, а тепер они занялись культурной работой, бросили ходить в церковь. Мы часто устраиваем спектакли. В драмкружке участвует 8 девушек. На спектакли собираются крестьяне соседних деревень. Плохо только, что ликпункта нет у нас в деревне. Желание учиться есть, но приходится в ликпункт ходить за 2 версты.

Гарулева.

Організавалі гурток.

Жанарганізатар на агульным сходзе сялянак растлумачыла нам аб „Беларускай работніцы і сялянцы“. Пасьля гэтага зараз-жа 18 жанчын падпісаліся на часопісь.

Арганізаваны гурток „Прыхільнікаў часопісі“ навучыць працоўных жанчын больш разумець і лепш выконваць грамадзкую працу.

Дэлегатка.

Мать, помогай школьніку!

Мы адчыняем сталую старонку, якой будзем дапамагаць мацерам правільна выхоўваць дзяцей. Работніцы і сялянкі—мацеры! Наладжвайце гутаркі, абгаварвайце на сходах гэтыя парады. Выяўляйце мясцовыя прыклады добрага і кепскага выхаваньня дзяцей. Пішэце свой вопыт у гэтым у „Белрабсялянку".

Некоторые матери думают, что школа учит детей только грамоте. Это мнение неверно. Школа учит не только грамоте, она также учит детей добросовестно относится к труду, аккуратно выполнять порученную работу. С ранних лет привыкая к работе, ребенок выростает работоспособным, аккуратным и любящим труд. В этом деле школе во многом может помочь мать. От матери также очень много зависит и успеваемость ребенка в школе.

Нам, учительницам, часто приходится встречать случаи, когда дети плохо успевают не потому, что у них плохие способности, а потому, что, уходя из школы, они представлены сами себе, за ними никто не следит, не помогает детям в работе.

Каждой матери легко это исправить при внимательном отношении к работе ребенка.

Как же мать может помочь?

Мать должна следить, как ребенок выполняет школьныя задания. Сделать это не так трудно, как кажется. Матери надо только посидеть пару часов, понаблюдать за работой ребенка. В это время мать может чинить, шить и даже чистить картошку. А ребенок спокойно работает, втягивается в работу и постепенно, сам того не замечая, становится ближе к успевающим, чем к отстающим.

Некоторые ребята отстают в школе и потому, что часто пропускают, опаздывают на занятия, а бывает что оставляют дома необходимые тетради, книги, ручки и перья. Это лишает ребенка возможности следить по книге, записивать необходимое, и вообще приучает его к рассеяности и неаккуратности. Часто успехи этих ребят начинают отставать.

И в таких случаях мать своевременно должна притти на помощь школе и своему ребенку. Каждая мать должна следить, чтобы ребенок перед сном укладывал тетради, книги, ручки в сумку. Мать должна делать все необходимое, чтобы ребенок не опаздывал в школу, не пропускал занятий. Часто матери сами небрежно относятся к своим обязанностям по отношению к детям. Не во время завтрак готов, не разбудила ребенка.

Матери нужно знать, что ребенок, который с ранних лет приучается к аккуратности, к добросовестному отношению к порученному делу, такой ребенок, став взрослым, тоже будет аккуратным и полезным. Пожалев разбудить ребенка, мать, сама того не зная, приносит ему большой вред. Потому что такой ребенок начинает отставать, становится небрежным к работе, отвыкает от школы.

Матери нужно помочь школе. Только при совместной работе над воспитанием ребят школы и семьи из учеников в будущем вырастут способные, любящие труд, ценные для пролетарского государства люди. Матерям также нужно быть близким школе: интересоваться ее жизнью, работой, следить за воспитанием и успехами своих и других ребят.

Учительница.

Бережы здароўе.

Боритесь с гриппом.

Гриппом болеют круглый год. Но в конце осени и весною заболевания учащаются. Иногда грипп поражает огромную часть населения, с большим количеством смертных случаев.

Вызывается грипп микробом, который находится в слизи носа и глотки больного. Больной человек разбрасывает капельки жидкости при кашле, чиханьи, сморканьи, громком разговоре, пении, и этим сеет заразу. Вот почему так легко и быстро передается болезнь—грипп.

Признаки болезни.

Болезнь начинается внезапно ознобом, жаром, общей разбитостью, головной болью, болью в конечностях, насморк, кашель, слезотечение, охриплость. Температура повышется до 38—39 градусов. В тяжелых случаях—до 40 градусов. Продолжительность болезни 4—7 дней, если нет осложнений.

Грипп сам по себе не опасен. Страшны его осложнения: воспаление легких, среднего уха, резкие изменения со стороны сердца, нервной системы и т. д. Болеют гриппом люди всех возрастов. Чаще заболевают 15—40-летнего возраста. Старики болеют редко, но за то тяжело переносят болезнь. Человек здоровый, в особенности со здоровым сердцем легко переносит грипп.

Как охранить себя от заболевания.

Готовясь к борьбе с гриппом, бросьте курить и не пейте спиртных напитков, ибо куренье и алкоголь ослабляют сердце и делают его менее выносливым. Содержите в чистоте помещение. Часто мойте тело в бане. Меняйте чаще белье. Обязательно употребляйте отдельные полотенца и носовые платки. Надо бороться с рукопожатиями. При рукопожатиях легко передается зараза. Боритесь с вредной привычкой—плевать на пол. Не следует навещать больных гриппом. При чиханьи и кашле прикривайте рот носовым платком.

Белье больного нужно стирать отдельно от остального белья. Не следует пользоваться общей посудой. Надо избегать спать на общих постелях. Не позволяйте детям пользоваться чужими игрушками.

Ухаживающие за больным, при выходе из его комнаты должны тщательно вытирать руки и лицо.

Рабочие и крестьяне должны помочь врачам и органам здравоохранения во время борьбы с гриппом, ибо сознательным отношением можно обезопасить от этой болезни.

Д-р Нэйфах.

Торф—багацьце Беларусі.

Па Беларусі амаль што ў кожным раёне маюцца залежы торфу, але яго не скарыстоўваюць для тых запатрабаваньняў, якія ёсьць у самога насельніцтва.

Селянін мае саломы нямнога, і то часьцяком траціць яе на корм жывёлы. Па гэтаму з подсьцілам, а значыцца і з гноем прыходзіцца туга. А для падсьцілкі заўсёды можна скарыстаць торф. Наогул торф можа быць добрым угнаеньнем.

Як карыстацца торфам.

Вадкасьць торф убірае ў сябе лепш як салома. Пры тарфянай падсьцілцы ніколі ня будзе той гразі, якая звычайна бывае ў хляве і вельмі дрэнна адбіваецца на здароўі жывёлы. Акрамя гэтага, торф добра ўбірае ў сябе газ, карысны для ўгнаеньня.

У ўгнаеньне торф ператвараюць дваяка.

Першы спосаб.

Торф прасушваюць ня менш як на працягу лета. Пасьля закладаюць яго ў хляве, дзе павінна стаяць жывёла, пластом таўшчынёю ў аршын, на гэта накладаюць пласт саломы. На працягу зімы трэба сачыць каб салома не зьляжалася вельмі шчыльна. Для гэтага трэба салому час-адчасу, варушыць, даваць магчымасьць вадкасьці працякаць у торф. Падсьцілаць заўсёды трэба адначасова торф і салому, бо такім чынам яны будуць добра перамешвацца.

Другі спосаб.

Найбольш просты спосаб тарфянога ўгнаеньня такі: трэба ўзяць торф з верхняй часткі нізавога балота, прасушыць яго і ўжываць як угнаеньне. Лепш торф загатаўляць у кампост. Гэта робіцца так: торф складаюць у прадаўгаватыя кучы, шырынёю ня больш сажэні. У такую кучу пажадана ўсыпаць некалькі вапны, хаця-б 10 пудоў на куб торфу. У такім выглядзе торф павінен праляжаць ня менш году, пасьля чаго ён ператвараецца ў добры гной. Добра, калі такую кучу хоць адзін раз у сярэдзіне году пераварочваюць.

Торф павышае ўраджайнасьць.

З вопыту бачна, што тарфяное ўгнаеньне дае лепшы ўраджай, як саламянае. Напрыклад, Ціміразеўскай сельска-гаспадарчай акадэміяй установлена, што дзесяціна зямлі, угноеная торфам, дае 159 пудоў, а ўгноеная звычайным саламістым гноем, дае 138 пудоў, турнэпс на тарфяным угнаеньні даў найлепшыя вынікі, таксама і іншыя культуры.

Як здабываць торф.

Як і дзе распачаць здабываньне торфу—аб гэтым патрэбна параіцца з аграномам ці мэліаратарам. Такія мерапрыемствы патрэбна праводзіць гуртом. Для гэтага трэба арганізавацца ў тарфянае таварыства. Тады і ўлада дапаможа гэтай справе. Для абароны балот у нас маюцца сталыя правілы, забараняючыя капаць торф дзе хто-б ні надумаўся. Тарфянае таварыства заўсёды можа хутчэй атрымаць дазвол на тое, каб капаць торф у лепшым месцы. Калі-б кожная сялянская гаспадарка загатовіла прыкладна 1—2 кубічных сажані торфу, то такая гаспадарка павышэньне ўраджаю, а разам з ім і агульнае становішча гаспадаркі—забясьпечыла.

Сялянка павінна быць актыўнай у гэтай справе. Ня трэба чакаць, пакуль хтось прыдзе, зарганізуе таварыства, а трэба самой сялянцы брацца за гэта мерапрыемства. Заўсёды трэба памятаць, што павышэньне ўраджайнасьці ва многім залежыць ад самога сялянства.

Агр. Сізаў.

(Працяг).

Тымчасам, я на чыгунку села і ў Віцебшчыну паляцела, у Кузьмінскі сельсават. Заходжу ў малочнае таварыства, якое 80 пайнікаў налічвае. Папрасіла я кіраўніцтва вялікае, каб жанок-пайнікаў на сход паклікалі. Думаю: „Малочныя справы павінны жанок цікавіць".

Аж мне кіраўніцтва ў адказ:

— Баб-пайнікаў амаль няма ў нас. Аб перадачы ім сяброўства мы паперку атрымалі і ціханька яе пад сукно паклалі. А што нам хіба за вушы ў сябры баб цягнуць, калі яны самі ня ідуць.

Ніяк вы не разьвітаецеся з валадарствам. Сядайце ў рэшата за такое гаспадарства.

Я-ж па суседзтву ад вас зазірну ў Загаранскі савгас.

— Добрага здароўя савгаскія людзі. Дзе вашы дэлегаткі.

— Э, аб чым пытае. Толку з іх ня было і ня будзе.

— Чаму?

— А таму, што нават ячэйка ня верыць у посьпехах гэтай зацеі. Яна кажа, што праца сярод жанчын савгасу—гэта дарэмная трата часу.

Разьвяла я толькі рукамі. Думала прашчацца з Гарадоцкімі куткамі. Але мне жанкі дарогу загарадзілі: „Ня выпусьцім з раёну, пакуль нашы ў рэшата не ўгадзілі".

Прышлося пакарыцца, з жаночай думкай згадзіцца.

Па Віцебшчыне я доўга не бадзялася—у Чарэю Аршанскай акругі накіравалася. Жанок там няпісьменных—хоць пруд прудзі. А з словам аб кніжцы да іх лепш не падхадзі. Аблаюць, заклююць, ня будзе мала. Зграбла я некалькі з іх у рэшата і далей махні-драла.

Прыплялася на запалкавую фабрыку „Днепр", у Рэчыцу. Гляджу, што гэта мне кмеціцца? У клеяльным цаху тых самых падклейшчыц бачыла назад месяцяў сем і пяць і зараз яны-ж там стаяць—працуюць у ахвоце.

— А калі вы будзеце на самастойнай рабоце?

— Майстры нашы чакаюць, пакуль ці рак у моры сьвісьне, ці іх хто-кольвек прыцісьне, прымусіць вучыць нас больш шчыра. А пакуль у першай зьмене з кваліфікацыяй ня сьмех, а сьлёзы. Запытае аб чым падклейшчыца, у адказ—папрокі, крык, пагрозы.

Прышлося і Дняпроўскіх хванабэрак зграбці за комля і подбежкі бегчы да Бягомлю.

Трохі з дарогі зьвярнула, у Чэрыкаў зазірнула. Аказала пашану доктару Бушану. Заходжу ў больніцу, прашу даць даведку аб хваробе сястрыцы, якая хварэе рожай і працаваць няможа. Але Бушан з цьвёрдай натурай.

— Я,—кажа,—даю водпуск толькі тым, у каго высокая тэмпэратура, і то толькі з новага каштарыснага году. Калі-ж хворасьць ня сунімецца, то я дам згоду, каб з гэткім відам залічыць на забясьпеку інвалідам.

Сястрычкі мае, грайце ў Бушанавы „дудкі!" Каб аб хворасьці вашай да новага году нідзе ня было чуткі. Калі-ж толькі заплачаце, у інваліды пападзеце, як бачыце.

А зараз я вам на закуску-вярхушку загадаю загадку-хітрушку.

Адгадайце загадку. За якія грошы аб'ежчык Дзьмітрыяў А. пабудаваў сабе хатку?

Можа ня ведаеце, пра якога Дзьмітрыява я вяду агітацыю? Гэта той самы, што ў 1925 годзе пусьціў у комін Ракаўскую капэрацыю.

Ну, што, угадалі?

Бачце, якія ўдалыя! Усё хочаце, каб я сама сказанула. Не, хопіць зараз, і так рэшата рукі адцягнула. Зараз на некалькі гадзінак думаю пайсьці ў адпачынак.

Мукасеева.

ІМЕНІ ЛЕНІНА

ЧЫТАЦЕ!

З СТУДЗЕНЯ 1929 ГОДУ

ЧАСОПІСЬ

„Беларуская Работніца і Сялянка“

БУДЗЕ ВЫХОДЗІЦЬ

ДВА РАЗЫ Ў МЕСЯЦ.

Замест 12 нумароў у год падпісчыкі атрымаюць 24 за тую-ж падпісную плату 15 кап. у месяц.

Часопісь дае розныя дадаткі:
выкрайкі, узоры рукадзельля, вышываньня, парады па сельскай гаспадарцы і інш.

Доўгатэрміновыя падпісчыкі будуць удзельнічаць у ВЯЛІКАЙ ЛЁТАРЭІ якая абвяшчаецца „Бел. Раб. і Сял.“ з студзеня.

Будзе разыграна шмат каштоўных рэчаў:
сэпаратары, льнамялкі, косы, калаўроты, бібліятэкі па выхаваньню дзяцей, гарнітуры цацак, адрэзы шэрсьці на адзеньне, сярпы, радыяпрыёмнікі, швейныя машыны, прасы, самавары.

Хаты-чытальні, завербаваўшыя найбольшую колькасьць доўгатэрміновых падпісчыкаў, атрымаюць у прэмію БІБЛІЯТЭКІ, гурткі кройкі і шыцьця — ШВЕЙНУЮ МАШЫНУ, дэлегацкі сход — НЕКАЛЬКІ МЕЙСЦ для паездкі ў Менск за кошт рэдакцыі на майскія сьвяты, лістаносцы—БОТЫ.

Сьпяшыце падпісацца на самую танную часопісь „Бел. Раб. і Сял.“ Дэлегацкія сходы, хаты-чытальні, лістаносцы, школы, гурткі прыхільнікаў часопісі, жаночы актыў—вярбуйце падпісчыкаў на „Б. Раб. і Сял.“

Рэдакцыя.

АДЧЫНЕНА ПАДПІСКА

на рэспубліканскую штодзенную газэту рабоча-сялянскай моладзі

„ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“

на 1929 год.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 к.
3 месяцы	90 к.
6 месяцаў	1 р. 80 к.
1 год	3 р. 30 к.

Падпіска прымаецца ўсімі паштовымі канторамі, упаўнаважанымі і лістаносцамі.

Менск, друкарня „БДВ“. Зак. № 1235. У ліку 8000 экз. Галоўлітбел № 618.